ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік упраўлення культуры Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта
А.В.Клімовіч
“ 8 ” студзеня 2025 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў” (далей – Агляд-конкурс).

2. Мэтамі і задачамі Агляду-конкурсу з’яўляюцца: выяўленне новых сучасных форм работы, вызначэнне шляхоў развіцця аматарскага руху, далучэнне насельніцтва да каштоўнасцей беларускай культуры, прыцягненне да культурна-масавых мерапрыемстваў розных узроставых катэгорый насельніцтва; садзейнічанне стварэнню новых аб’яднанняў, далучэнню насельніцтва да розных форм дасугавай дзейнасці; абагульненню існуючага вопыту, яго прапагандзе і ўкараненню ў практыку клубнай работы.

3. Арганізатарамі Агляду-конкурсу з’яўляюцца: упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама, дзяржаўная ўстанова культуры “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” (далей – ДУК “Гродзенскі АМЦНТ”).

4. Пры арганізацыі, падрыхтоўцы і правядзенні Агляду-конкурсу арганізатары і ўдзельнікі кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і сапраўднай Інструкцыяй.

5. Агульнае кіраўніцтва падрыхтоўкай і правядзеннем Агляду-конкурсу ажыццяўляецца арганізацыйным камітэтам (далей – аргкамітэт), склад якога зацвярджаецца дадаткова (Дадатак 1).

6. Аргкамітэт пакідае за сабой права ўносіць змены ў дадзеную Інструкцыю аб парадку арганізацыі і правядзення, а таксама аб пераносе даты правядзення Агляду-конкурса (у іншыя тэрміны).

7. Агляд-конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.

8. У Аглядзе-конкурсе прымаюць удзел дзіцячыя і дарослыя аматарскія аб’яднанні Гродзенскай вобласці.

9. Агляд-конкурс праводзіцца ў 2 этапы: 1 этап – раённыя адборачныя агляды, пасля правядзення якіх неабходна выслаць на e-mail: info@gromc.by ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” з пазнакай “Свет

захапленняў” дакументальнае пацвярджэнне аб пераможцах раённага этапу (пратакол, завераны подпісам кіраўніка і пячаткай установы; абавязкова відэа-, фота – матэрыялы паседжання аматарскага аб’яднання ў рамках раённага адборачнага агляда), 2 этап – абласны адборачны агляд праводзіцца з сакавіка па верасень 2025 г. (Дадатак 2).

10. У рамках 1 этапа  раённымі (гарадскімі) установамі культуры клубнага (змешанага) тыпу праводзяцца  адборачныя прагляды адкрытых пасяджэнняў з мэтай вылучэння лепшых аматарскіх аб’яднанняў для ўдзелу ў 2 этапе Агляду-конкурсу.

11. Для ўдзелу ў 2 этапу Агляду-конкурсу аддзелы/сектары культуры рай(гар)выканкамаў прадстаўляюць да 3-х лепшых адкрытых пасяджэнняў аматарскіх аб’яднанняў – пераможцаў раённых (гарадскіх) адборачных аглядаў.

Заяўку, завераную подпісам кіраўніка і пячаткай установы згодна Дадатку 3 неабходна выслаць на e-mail: info@gromc.by ДУК “Гродзенскі АМЦНТ” з пазнакай “Свет захапленняў”.

12. Да ўдзелу ў 2 этапе Агляду-конкурсу кіраўнікам аматарскіх аб’яднанняў неабходна падрыхтаваць: паказ адкрытага пасяджэння, якое найбольш яскрава адлюстроўвае накірунак дзейнасці аб’яднання, адпавядае яго статуту. Працягласць праграмы адкрытага пасяджэння павінна складаць не менш за 30 хвілін. Калі адкрытае пасяджэнне праводзіцца на адкрытых пляцоўках, то для яго дэманстрацыі неабходна ўлічваць наяўнасць роставых лялек, аб’ёмнасць рэквізіту, абсталяваную пляцоўку для гледача і г.д. Адкрытыя пасяджэнні праводзяцца з запрашэннем мясцовага насельніцтва.

Прадстаўляецца накапляльная папка-партфоліа за 2024-2025 гг. (планы работы, сцэнарныя матэрыялы, відэа і фотаматэрыялы пасяджэнняў, копіі водгукаў у сродках масавай інфармацыі аб творчай дзейнасці калектыву), арганізуецца выстаўка-прэзентацыя і інш.

13. Пры падвядзенні вынікаў Агляду-конкурсу і заахвочванні пераможцаў журы (Дадатак 4) карыстаецца наступнымі крытэрыямі: ацэнка паказу адкрытага пасяджэння і ацэнка агульнай дзейнасці аматарскага аб’яднання за апошнія 2 гады, згодна з прадстаўленымі матэрыяламі.

Журы 2 этапу Агляду-конкурсу пры ацэнцы паказу адкрытага пасяджэння ўлічвае: творчую задуму і арыгінальнасць ідэі адкрытага пасяджэння;  актуальнасць выбару тэмы; кампазіцыйная пабудова праграмы і разнастайнасць форм пасяджэння;  майстэрства арганізацыі сцэнічнай прасторы; мастацкае і музычнае афармленне праграмы.

14. Журы 2 этапу агляду-конкурсу ацэньвае аматарскае аб’яднанне па 10-бальнай сістэме: сярэдні бал выводзіцца па кожнаму члену журы, а затым балы сумуюцца і выводзіцца сярэдні бал па двух крытэрыях, згодна пункта 16 дадзенай Інструкцыі.

15. Журы 2 этапа Агляду-конкурсу ўзнагароджвае пераможцаў дыпломамі лаўрэата (I, II, III ступені) і прызамі ў дзвюх узроставых катэгорыях (дзіцячая, дарослая) па наступных намінацыях:

1. грамадска-культурны клуб (патрыятычныя, інтэлектуальныя, воінаў-інтэрнацыяналістаў, ветэранаў, аматараў выяўленчага мастацтва, моладзі, жанчын, дзяцей і падлеткаў клубы і інш.), у тым ліку прыродазнаўчы і фізкультурна-аздараўленчы клубы (клуб аматараў народнай медыцыны, бегу, аэробікі, вандраванняў і турызму, гісторыі алімпійскага руху і спорту, клуб балельшчыкаў, экалагічны клуб, клуб садаводаў, агароднікаў, кветкаводаў, птушкаводаў, аматараў жывёл, акварыўмістаў і інш.);

2. клуб традыцыйнай народнай культуры (клубы аматараў фальклору, майстроў дэкаратыўна-прыкладной творчасці і інш.), у тым ліку гісторыка-краязнаўчы клуб (клубы аматараў гісторыі, творчых асоб, вывучэння гісторыі роднага краю і інш.);

3. сямейна-бытавы клуб (навукова-тэхнічны клуб, клуб аматараў кулінарыі, беларускай кухні, шыцця, вязання і іншых відаў рукадзелля, клубы маладой сям'і, шматдзетных маці, паляўнічых, рыбаловаў, мота-, вела-, аўтааматараў і інш.).

16. Астатнія ўдзельнікі ўзнагароджваюцца дыпломамі за ўдзел у Аглядзе-конкурсе.

17. Журы пакідае за сабой права ў межах агульнага прызавога фонду аб'ядноўваць, дзяліць прызавыя месцы паміж удзельнікамі розных узроставых катэгорый.

18. Рашэнне членаў журы па выніках Агляду-конкурсу фіксуецца ў пратаколе (падпісваюць усе члены журы), які размяшчаецца не пазней 10 каляндарных дзён з дня правядзення Агляду-конкурсу на афіцыйным сайце ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

19. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

20. Кантактныя тэлефоны аргкамітэта: +37515262380l; +375152687934; e-mail: info@gromc.by.

21. Фінансаванне Агляду-конкурсу ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі АМЦНТ".

22. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, дыпломы.

23. Для фінансавання Агляду-конкурсу на ўсіх этапах могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

24. Арганізатары Агляду-конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў аматарскіх аб'яднанняў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

Дадатак 1
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

| | |
|---|---|
| Клімовіч А.В. | начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня аргкамітэта;* |
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *намеснік старшыні аргкамітэта;* |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Мерчы Т.І. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Рамановіч Н.І. | намеснік дырэктара па асноўнай рабоце ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 4
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

## СКЛАД ЖУРЫ
абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

| | |
|---|---|
| Пекар А.Ю. | галоўны спецыяліст упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама, *старшыня журы;* |
| Рамановіч Н.І. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, *намеснік старшыні журы;* |
| Хільмончык К.В. | дырэктар ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Мерчы Т.І. | загадчык аддзела аматарскай творчасці і культурна-дасугавай дзейнасці ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Пятрук А.П. | вядучы метадыст па народным мастацкім рамёствам ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”; |
| Барысевіч Я.А. | вядучы метадыст па арганізацыі выставак, конкурсаў, фестываляў ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці” |

Дадатак 2
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

ГРАФІК

*правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў” у 2025 годзе*

***Сакавік***

1. г. Слонім.
2. Слонімскі раён.
3. Зэльвенскі раён.

***Красавік***

4. Лідскі раён.
5. Іўеўскі раён.
6. Воранаўскі раён.

***Май***

7. Ашмянскі раён.
8. Астравецкі раён.
9. Смаргонскі раён.

***Чэрвень***

10. Карэліцкі раён.
11. Дзятлаўскі раён.
12. Навагрудскі раён.

***Жнівень***

13. Шчучынскі раён.
14. Гродзенскі раён.
15. Мастоўскі раён.

***Верасень***

16. Бераставіцкі раён.
17. г. Гродна.
18. Свіслацкі раён.
19. Ваўкавыскі раён.

Дадатак 3
да Інструкцыі аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога агляду-конкурсу аматарскіх аб’яднанняў “Свет захапленняў”

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела (загадчык сектара) культуры гар(рай)выканкама
“___” ________________ 2025 г.

ЗАЯЎКА
на ўдзелу ў абласным аглядзе-конкурсе аматарскіх аб’яднанняў
“Свет захапленняў”

1. База дзейнасці аматарскага аб’яднання (поўная назва) ______________________________________________________________________

2. Поўная назва аматарскага аб’яднання
______________________________________________________________________

3. Накірунак дзейнасці: грамадска-культурны
4. Конкурсная намінацыя:_____________________________________________
5. Узроставая катэгорыя: дарослыя з абмежаванымі магчымасцямі
6. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка аматарскага аб’яднання
______________________________________________________________________
7. Назва конкурснага адкрытага пасяджэння: шоу-праграма “Мы разам!”

8. Працягласць адкрытага пасяджэння _________________________________
9. Кантактныя тэлефоны_____________________________________________

Кіраўнік базавай установы ____________________
*(подпіс)*